# Новы прэм'ер-міністр — Сяргей Лінг



Цэнтральны орган дзяржаўнага кіравання — Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь узначаліў вядомы палітык і эканаміст Сяргей Лінг. 19 лютага Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу дала згоду Прэзідэнту краіны на назначэнне Сяргея Лінга прэм'ер-міністрам.

Сяргей Сцяпанавіч Лінг нарадзіўся ў Мінску ў 1937 годзе. Па адукацыі — вучоны аграном, закончыў у 1960 годзе Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Першыя дзесяць гадоў яго працоўнай дзейнасці былі непасрэдна звязаны з сельскай гаспадаркай. Працаваў аграномам, галоўным аграномам, начальнікам шэрагу раённых упраўленняў сельскай гаспадаркі. З 1971 года Сяргей Лінг знаходзіўся на савецкай і партыйнай рабоце.

У 1986 годзе ён узначаліў Дзяржкамітэт БССР па цэнах, у 1991 годзе назначаны старшынёй Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па эканоміцы і планаванню, міністрам эканомікі. У 1991—1994 гадах Сяргей Лінг працаваў намеснікам Старшыні Савета Міністраў.

Пасля ўвядзення ў рэспубліцы пасады прэзідэнта і выбрання новага складу ўрада Сяргей Лінг быў назначаны намеснікам прэм'ер-міністра.

18 лістапада 1996 года ўказам Прэзідэнта ён быў назначаны выконваючым абавязкі прэм'ер-міністра.

Сяргей Лінг узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, шэрагам медалёў, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР.

**БЕЛТА.**